В номере:

Спасительная… солома с. 8



А деньги – под ногами с. 11



В чем счастье сельчанки? с. 6



Раённая масавая газета. Заснавана 24 сакавіка 1935 года

# ДОБРУШСКІ КРАЙ

№62 (10880)

17 жніўня 2019 года Субота



# Пралье святло на многія “чаму”

**Фельчар-лабарант Марына Бурава знаходзіцца ў такім узросце, пра які кажуць: лепшае яшчэ наперадзе. Дабрушанка некалькі год таму скончыла Мазырскае медыцынскае вучылішча, працаўладкавалася ў раённы цэнтр гігіены і эпідэміялогіі.**

Малады спецыяліст займаецца цікавай і неабходнай для людзей работай. Кожны з нас не раз у жыцці задумваўся над тым, якую ваду мы п’ём, якія прадукты спажываем. Асабліва актуальным пытаннем гэта стала пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Праліць святло на многія “чаму” і “як” дапамагаюць супрацоўнікі санітарна-гігіенічнай лабараторыі. У ліку іх – Марына Бурава.

– У летнія месяцы ўзрастае колькасць праверак дароў лесу, – кажа Марына. – За апошні час намі даследавана 53 пробы грыбоў з розных лясніцтваў. У 9 з іх выяўлена перавышэнне допушчальных паказчыкаў. У 2 выпадках аказаліся небяспечнымі для ўжывання і ягады.

Па словах фельчара-лабаранта, некаторыя жыхары раёна перакананы: лясы цераховўскай зоны ў радыяцыйным плане бяспечныя. А значыць, сабраныя тут ягады і грыбы несці на праверку ў райЦГЭ не варта, бо яны “чыстыя”. Але такі падыход легкадумны. “Брудныя” грыбы і ягады з гэтай зоны трапляюцца перыядычна.

Іншая сітуацыя з харчовымі прадуктамі, садавінай і гароднінай. Уся прадукцыя, якую прыносілі грамадзяне на бясплатную праверку, аказалася бясшкоднай.

Як адзначыла Марына Бурава, важна, каб кожны чалавек вёў здаровы лад жыцця, сачыў за харчаваннем і цікавіўся, што з’яўляецца кожны дзень на яго абедзенным стале.

**Леанід ДУБОЎСКІ**
**Фота Яўгена УСЦІНАВА**

## Весткі з месцаў

### Якасць пацвярджае абкатка

**Новае абсталяванне для праверкі работы электронных, паліўных сістэм і абкаткі дызельных рухавікоў аўтатрактарнай тэхнікі “Электронная аўтаматыка” запушчана ў работу на прадпрыемстве «Белагразапчастка».**

Варта адзначыць: калектыў добрушскіх рамонтнікаў укараніў гэту навацыю расійскай вытворчасці адным з першых у краіне.

– Тут будуць правярацца ў тэставым рэжыме адрамантаваныя намі рухавікі Яраслаўскага і Мінскага маторных заводаў стандартаў Еўра-3 і Еўра-4, – тлумачыць дырэктар прадпрыемства Уладзімір Паўяльчук. – Такімі ўжо аснашчаецца частка новых трактароў і камбайнаў, што паступаюць у сельгаспрадпрыемствы і арганізацыі вобласці і рэспублікі. Да гэтага рамантаваліся ў нас у асноўным сілавыя агрэгаты ўзроўню экалагічнай бяспекі Еўра-0 і Еўра-2. Як бачна, мы стараемся ісці ў нагу з тэхнічным прагрэсам…

Як стала вядома, выпрабаванні абкаткай пасля рамонту з прымяненнем новага абсталявання ў “Белагразапчастцы” прайшлі ўжо тры рухавікі – з папяровай фабрыкі “Герой працы”, а таксама аднаго з гаспадарак Клецкага раёна, што на Міншчыне.

**Мікалай ЖДАНОВІЧ**

### Нашы ў клубе

**Трох жывёлаводаў сельгаспрадпрыемства “Завідаўскае” прынялі ў абласны клуб майстроў высокіх надояў і прываг. Яго першае пасяджэнне адбылося на гэтых днях у Мазыры.**

Па надоі малака на карову гаспадарка выйшла на перадавыя пазіцыі ў раёне. Ключ да поспеху, па словах кіраўніка “Завідаўскага” Таццяны Бялян, не толькі ў новых тэхналогіях, але і адданых справе людзях. Такіх, як аператар машыннага даення Ала Моніч, якая за мінулы год ад кожнай каровы надаіла больш за 8 тон малака, загадчык дайльна-малочнага блока Дзяніс Грэчка, цялятніца Валянціна Галота.

**Людміла НАЗАРАВА**

ISSN 2073-1000

## погода

Долгота дня 14.46
Луна
17, 18 августа – в Рыбах,
19, 20 – в Овне



Последняя четверть
23 августа

**18 августа**
НОЧЬЮ +13…+15
ДНЕМ +21…+23
Переменная облачность.
Без осадков.
Ветер с.-западный 3-5 м/с.

**19 августа**
НОЧЬЮ +11…+13
ДНЕМ +24…+26
Ясно.
Без осадков.
Ветер ю.-западный 2-4 м/с.




## Предвыборная агитация стартует в середине октября

**Предвыборная агитация на парламентских выборах в Беларуси стартует в середине октября. Об этом сообщила журналистам председатель ЦИК Лидия Ермошина.**

Она пояснила, что предвыборная агитация начинается после регистрации кандидатов в депутаты. Так, их выдвижение завершается 7 октября, на регистрацию отводится десять дней. Это значит, предвыборная агитация начнется после 17 октября. Если кандидата зарегистрируют раньше этого срока, то он сможет приступить к агитации.

Лидия Ермошина поделилась ожиданиями от предвыборной агитации, подчеркнув, что только от кандидатов в депутаты зависит, насколько этот этап будет запоминающимся. «Если кандидаты используют хотя бы все то, что им бесплатно дает государство (выступления в газетах, на телевидении, участие в теледебатах), то уже это будет достаточно оживленно», – считает председатель ЦИК.

**По материалам СМИ**

*НА СВЯЗИ*

**19 августа с 10.00 до 12.00 по телефону 3-15-43**
пройдет прямая телефонная линия с участием
Ольги Владимировны СЫЧЕВОЙ,
председателя суда Добрушского района.

*ПРИЕМ*

**23 августа с 12.00 до 13.00**
в административном здании райисполкома (г. Добруш, ул. князя Ф.И. Паскевича, 11)
прием граждан и представителей юридических лиц проведет
Юрий Алексеевич СЕНЬКО,
председатель Государственного таможенного комитета Республики Беларусь.
Предварительная запись на прием – с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30 по телефону 3-29-52 (кроме субботы и воскресенья).

*РАСТЕНИЕВОДСТВО*

# «Потингер» и другие ноу-хау

**Опытнейший механизатор хозяйства Николай Усов сеет рапс. Поглядеть на чудо техники, которым он управляет, останавливаются не только коллеги-механизаторы.**

Николай отмечает:

– Горжусь, что новую технику доверили мне. Желающих поработать на ней было немало.

В «Завидовском» Николай – старейший механизатор. Работает здесь с 90-го года минувшего столетия. За это время сменилось шесть руководителей хозяйства. А техническую новинку ему доверили вовсе не за солидный стаж работы. Решающими факторами стали профессионализм и ответственность.

– Угадали с кадрами, – отмечает директор сельхозпредприятия Татьяна Белян. – Дорогостоящее оборудование, а мы приобрели не только сеялку, но и дискатор этой фирмы, доверили самым надежным.

В поле «Потингер» провожали по старинной традиции мореплавателей – разбив бутылку шампанского о корпус. В последнее время это становится традицией. Так был отмечен и первый выход в поле нового «Кировца». Словом, в «Завидовском» на новинки – большие надежды.



**Механизатор Николай Усов**

Сеялке «Потингер» приписывают в узких аграрных кругах способность увеличивать урожай.

– Главное ее отличие от отечественных агрегатов – дополнительная обработка почвы. Диски взрыхляют почву, 12 валиков прижимают ее. Только потом подаются семена. В других условиях пришлось бы пускать перед сеяльным агрегатом дополнительные единицы техники. А это – немалые расходы, – разъясняет принцип действия австрийской новинки главный агроном Татьяна Рекашова.

Более 4 тысяч гектаров площадей уже обработано с помощью приобретенных новинок. «Завидовцы» – среди лидеров в области и районе по севу рапса.

– Этому поспособствовало то, что мы раньше других закончили уборку зерновых, – говорит Татьяна Рекашова. – Было достаточно времени, чтобы в оптимальные сроки и подготовить почву, и начать сев.

Несмотря на сложные условия погоды в этом году в среднем получили более чем 10 центнеров рапсосемян с гектара. На будущий год в хозяйстве под эту культуру отвели 400 гектаров.

**Наталья ВАСИЛЬЕВА**
**Фото Евгения УСТИНОВА**

*ТЕМА НЕДЕЛИ*

## Акцент – на рост доходов

**Президент Беларуси Александр Лукашенко совершил рабочую поездку в Могилевскую область. Глава государства посетил Костюковичский район, где ознакомился с развитием юго-восточного региона области.**

Детально рассмотреть состояние дел в регионе Глава государства пообещал во время недавних кадровых назначений. Четыре года назад для активизации социально-экономического развития этих территорий были приняты указ и программа, направленные на создание благоприятных условий проживания населения.

Глава государства напомнил о своем требовании: люди должны быть уверены в завтрашнем дне, иметь работу, достойную заработную плату и комфортные условия для проживания.

Как доложили Президенту, в Могилевской области для завершения уборки зерновых нужно всего 4-5 погожих дней.

Александр Лукашенко также обратил внимание на важность обеспечения надлежащих условий хранения урожая зерна кукурузы, что актуально для нужд животноводства. «Надо взять на контроль и тот недобор, который, возможно, будет по колосовым зерновым, надо восполнить зерном кукурузы», – поручил Глава государства.

Президенту также доложено о результатах социально-экономического развития Костюковичского района и Могилевской области. Один из главных акцентов руководство региона делает на работе с убыточными предприятиями, принимая меры по нормализации их финансово-экономического положения и обеспечению роста доходов населения.

**БелТА**

# Лідары жніва

Аператыўная інфармацыя па стане на 14 жніўня 2019 года



**Па намалоце сярод экіпажаў камбайнераў:**

Самойленка Пётр Рыгоравіч, Варганаў Андрэй Мікалаевіч, ААТ "Калінінскі", на КЗС-1218 убралі 505 гектараў плошчаў і намалацілі 1318,9 тоны зерня.

Варганаў Мікалай Анатольевіч, Данільчанка Мікалай Пятровіч, ААТ "Калінінскі", на КЗС-1218 убралі 508 гектараў плошчы і намалацілі 1316,2 тоны зерня.

Герасіменка Сяргей Уладзіміравіч, Панкоў Андрэй Аляксеевіч, ААТ "Калінінскі", на КЗС-1218 убралі 362 гектара плошчаў і намалацілі 916,2 тоны зерня.

**Па намалоце сярод маладзёжных экіпажаў камбайнераў:**

Малашанка Яўген Рыгоравіч, Шустаў Валерый Уладзіміравіч, КСУП "Крупец", на КЗС-1218 убралі 245 гектараў плошчаў і намалацілі 747 тон зерня.

Кайдуноў Андрэй Вячаслававіч, Краўчанка Яўген Аляксандравіч, СУП "Церахоўка-Агра", на КЗС-1218 убралі 374 гектара плошчаў і намалацілі 744,4 тоны зерня.

Марфушкін Аляксандр Аляксандравіч, Сычоў Сяргей Сяргеевіч, ААТ "Уцеўскае", на КЗС-1218 убралі 355,3 гектара плошчаў і намалацілі 738,4 тоны зерня.

**Сярод вадзіцеляў на адвозцы зерня:**

Лебедзеў Генадзь Рыгоравіч, ААТ "Завідаўскае", на МАЗ-650108 перавёз 1530 тон зерня.

Старацітараў Аляксандр Мікалаевіч, ААТ "Калінінскі", на ГАЗ-САЗ-35071 перавёз 1310,1 тоны зерня.

Бабраўнічы Аляксандр Міхайлавіч, КСУП "Баршчоўскі", на МАЗ-555 перавёз 1208,6 тоны зерня.

Скарабагаты Уладзімір Мікалаевіч, ААТ "Калінінскі", на МАЗ-551605 перавёз 1069,8 тоны зерня.

**Сярод маладых вадзіцеляў на адвозцы зерня:**

Ярмоленка Антон Аляксандравіч, ААТ "Калінінскі", на МАЗ-555102 перавёз 1401,3 тоны зерня.

Шкурко Міхаіл Васільевіч, ААТ "Уцеўскае", на МАЗ-551605 перавёз 991,2 тоны зерня.